# "Няма горшага за той суд, якімсудзішсябе сам"
# (па апавяданні Віктара Праўдзіна "Бездань").
# Для вучняў 8–11 класаў

Метадычная распрацоўка ўрока пазакласнага чытання
па сучаснай беларускай літаратуры для вучняў 8-11 класаў

**Т. М. Івашка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 2 г. Жлобіна

**Ход урока**

1. **Арганізацыйны момант**

*Прыём "Камплімент"*

Настаўнік вітаецца з вучнямі і аднаму вучню на першай парце робіць камплімент (*Андрэй, ты сёння цудоўна выглядаеш, я жадаю табе добрага настрою на ўроку і плённай працы!*). Кампліменты перадаюцца вучнямі па ланцужку, апошні вучань гаворыць камплімент настаўніку.

2. **Слова настаўніка:**

Сённяшні ўрок пазакласнага чытання мы прысвяцім знаёмству з творам нашага сучаснага беларускага пісьменніка, імя якога Віктар Праўдзін. Гэта аўтар, які звяртаецца ў сваіх творах да самых разнастайных праблем сучаснасці. Яго апавяданні і раманы прыцягваюць увагу чытачоў сваёй праўдзівасцю, уменнем прымусіць чалавека глыбока зазірнуць у сваю душу.

3. **Паведамленне вучня пра асобу В. Праўдзіна.**

Віктар Аляксандравіч Праўдзін нарадзіўся 11 мая 1955 года ў горадзе Ліда. Скончыў Шаркаўшчынскую сярэднюю школу. Потым служыў на Балтыйскім флоце. Закончыў Мінскую Вышэйшую школу міліцыі МУС СССР. Доўгі час працаваў у праваахоўных органах, потым у часопісах

“Нёман” і “Полымя”, у выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Зараз – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пачаў друкавацца ў 1985 годзе. Аўтар кніг “Візіцёр з поўначы” (1990), “Боль” (1996), “Экзгумацыя” (1997), “Шлях да Галгофы” (2002). Аўтар раманаў “Вяртанне з апраметнай”, “Танцавальны марафон”, “Нелюбімыя гінуць”.

**4. Слова настаўніка:**

Так, тое, што В. Праўдзін доўгі час працаваў у праваахоўных органах, безумоўна, не магло не адбіцца на яго творчасці. І, канешне, многія яго творы заснаваны на рэальных падзеях, а героямі гэтых твораў з’яўляюцца звычайныя людзі, якія жывуць поплеч з намі, змагаюцца са сваімі праблемамі.

Адной з важных праблем, якую закранае аўтар у сваіх творах, з’яўляецца праблема п’янства, з-за якога чалавек перастае быць чалавекам, ператвараецца ў сапраўдную жывёлу, з-за якога блізкія людзі становяцца чужымі і ненавідзяць адзін аднаго.

**5. Зварот да цытат на дошцы.**

“П’янства знішчае чалавека, забірае ў яго розум,ва ўсякім выпадку на пэўны час, і ў выніку ператварае яго ў жывёлу”. (Ж.-Ж. Русо)

“Звычка ўжываць алкаголь шкодзіць чалавеку больш, чым вайна, голад і чума разам узятыя”. (Ч. Дарвін)

*Вучні абмяркоўваюць цытаты і выказваюць сваю думку.*

**6. Слова настаўніка:**

Праблема п’янства сярод моладзі, на жаль, з кожным годам робіцца ўсё больш актуальнай. Сучасныя падлеткі рана пачынаюць ужываць спіртныя напоі, спрабуючы спачатку піва, а затым паступова пераходзяць і на моцны алкаголь. Некаторыя лічаць, што гэта модна, што з бутэлькаю піва яны выглядаюць больш дарослымі і самастойнымі. Некаторыя проста ўжываюць алкаголь “за кампанію”, каб не выглядаць белай воранай. Многія падлеткі

бяруць прыклад са сваіх бацькоў: па святах можна трошкі і выпіць, нічога страшнага не здарыцца.

Але моладзь павінна добра ўсведамляць, да чаго можа прывесці празмернае ўжыванне алкаголю. Гэта не толькі шкода для ўласнага здароўя, але і разлад у сям'і. Так, алкаголь можа стаць прычынай таго, што сапраўдныя чалавечыя ўзаемаадносіны паміж самымі блізкімі людзьмі паступова руйнуюцца. Муж пачынае сварыцца з жонкай, падымае на яе руку, увесь гэты жах бачаць маленькія дзеці… Дарослы сын ненавідзіць сваю родную маці за тое, што яна не дае яму грошы на бутэльку віна… Такіх прыкладаў сёння можна прывесці безліч.

Праблеме п'янства, якое стала прычынай распаду некалі шчаслівай сям'і і нават смерці роднага чалавека, прысвечаны твор В. Праўдзіна "Бездань".

7. **Слоўнікавая работа**

Вучні ў слоўніку шукаюць значэнне слова "бездань".

**бездань,**

**1.** *Бяздонная прорва, невымерная глыбіня.*

**2.** *Пераноснае значэнне. Вялікая колькасць чаго-небудзь, што нельга палічыць; безліч, процьма.*

**3.** *Пераноснае значэнне. Тое, што раздзяляе, раз'ядноўвае каго-небудзь з кім-небудзь; прынцыповыя разыходжанні паміж кім-небудзь у чым-небудзь.*

**Настаўнік:** Як вы думаеце, пра што пойдзе гаворка ў творы В. Праўдзіна? *(Адказы вучняў)*

А разглядаць мы гэты твор будзем у незвычайнай форме: правядзём суд над галоўным героем твора Васілём.

8. **Абмеркаванне твора.**

**Вучань-суддзя:** Устаць! Суд ідзе! Слухаецца справа аб злачынцу Васілю, які, стаўшы п'яніцам, зневажае сваіх бацькоў, забірае пенсію ў старой маці сабе на гарэлку, ганьбіць памяць свайго бацькі-франтавіка, які загінуў на вайне.

**Вучань-пракурор:**Мы абвінавачваем Васіля ў тым, што яго п'янства стала прычынай смерці яго маці, калі ён выкінуў яе на балкон зімой за тое, што яна не хацела даваць яму грошы на гарэлку.

**Вучань-адвакат:**Але ж чакайце…Васіль не заўсёды быў такім. Штосьці яго зламала. Давайце разбярэмся. Я выклікаю сведку.

**1 вучань-сведка:** Можна сцвярджаць, што калісьці сям'я Лявона і Лявоніхі была шчаслівай. Вось яны разам на сенажаці… Пачалася навальніца, і яны ўкрываюць плашчом маленькага Васілька, шчаслівымі вачыма глядзяць на сыночка… Пасля смерці мужа Лявоніха як магла гадавала сына сама, працавала на трох работах, старалася зрабіць так, каб сыну было добра, каб не ведаў ён пакут. Стварыўшы сваю ўласную сям'ю, Васіль увесь вольны час аддаваў ёй і любімай рабоце. Ён вырашыў палепшыць канструкцыю станка і цэлы год працаваў над чарцяжамі. Але калі галоўны інжынер адмовіў яму, сказаў, што яго веды нікому не патрэбны, у Васіля апусціліся рукі. З таго часу Васіль часта стаў наведвацца туды, дзе можна заліць сваё гора. Лявоніха тады заступалася за сына перад яго жонкай Марыяй: "На тое і мужык, каб мог выпіць чарку-другую". Але Марыя такога жыцця не вытрымала, і яны з Васілём разышліся. І калі Лявоніха кінулася ратаваць сына, было ўжо позна – кінуць піць ён не мог, а хваробу лячыць не хацеў.

**Вучань-суддзя:** Атрымліваецца, у тым, што Васіль стаў п'яніцам, вінаваты абставіны, а таксама галоўны інжынер, які не падтрымаў праект Васіля.

**Вучань-пракурор:**Гэта не так!Бо чалавек сам вырашае, як яму жыць, ён сам гаспадар свайго жыцця і свайго лёсу! Васіль, як сапраўдны баязлівец, перастаў змагацца, апусціў рукі, знайшоў выйсце ў тым, каб толькі заліваць сваё гора гарэлкай. Сам зруйнаваў сваю сям'ю. Ён сам абраў сабе такі шлях. Стаўшы алкаголікам, ён пачаў здзекавацца з роднай маці. Я выклікаю сведку.

**2 вучань-сведка:**Калі Васіль ужо не мог спраўляцца са сваёй хваробай, Лявонісе прыходзілася вельмі цяжка. Спачатку сын выпрошваў грошы на

гарэлку падманам. Потым пачаў забіраць матчыну пенсію сілай. Ён папракаў маці за тое, што яна нічога не мае, акрамя гэтай кватэры. У той час як сусед расстараўся на жыццё і дзецям і ўнукам, забяспечыў іх да старасці. Васіль прымушаў Лявоніху ісці ў выканкам, прасіць “наркомаўскія” сто грамаў, што бацька недапіў за два гады да канца вайны. Гаварыў, што не да твару сыну франтавіка піць чарніла і адэкалон… А калі Лявоніха, не вытрымаўшы, сказала, што не сын ёнпасля гэтага свайму бацьку, Васіль страшна яе абразіў… З кожным днём гэтая бездань паміж маці і сынам станавілася ўсё большай. Васіль прыходзіў п’яны, крычаў на маці, штурхаў яе з пагрозай, зневажаў яе, сілай забіраў грошы. Яна не пазнавала ў ім свайго ранейшага Васілька… А аднойчы ён п’яны выцягнуў маці на балкон і зачыніў там, а сам заснуў у крэсле насупраць балкона. Тады была зіма… Праз тры дні суседзі хавалі Лявоніху.

**Вучань-суддзя:** Суд выдаляецца на вырашэнне справы.

**Настаўнік:** Дзеці, скажыце, калі ласка, якая асноўная думка гэтага твора? (Адказы вучняў)

У якім радку, на ваш погляд, аўтар лаканічна перадаў ідэю твора? *(“Сын хварэе, а памерла маці”)*

Чытаючы твор, вы, канешне, заўважылі, што В. Праўдзін карыстаецца жывой, зразумелай мовай. У апавяданні аўтар ужывае і багата моўных залацінак – фразеалагізмаў. Давайце паслухаем вучня-даследчыка, які знайшоў у творы фразеалагізмы, і патлумачым іх значэнне.

**Вучань-даследчык называе фразеалагізмы, якія сустракаюцца ў апавяданні:** закрануць за жывое, лезці ў душу, у лапці абуць, узяцца за розум, апусціць рукі, мора па калена, несці свой крыж, узяць сябе ў рукі, лазара пець, іскры замільгалі ў вачах, з глузду з’ехаць.*(Вучні тлумачаць значэнне фразеалагізмаў).*

**Настаўнік:** Успомніце, для характарыстыкі якіх герояў ужываюцца гэтыя фраземы.*(Адказы вучняў)*

А зараз падумайце, чаму апавяданне мае назву “Бездань”, якое з трох значэнняў гэтага слова тут раскрываецца? (Вучні прыходзяць да высновы, што ўсе тры значэнні слова раскрываюцца ў творы.) Адказы могуць быць наступныя:

Бездань – бяздонная прорва –такая загана, як п’янства, зацягвае чалавека на самую глыбіню, адкуль потым вельмі цяжка выбрацца.(У такую бездань трапляе Васіль.)

Бездань – безліч, процьма – безліч тых пакут, якія навальваюцца на родных, блізкіх людзей, калі хтосьці побач з членаў сям’і знаходзіцца пад уладай такой заганы, як п’янства.(Бездань пакут, турбот узвальваюцца на плечы старой Лявоніхі, якая не жыве, а пакутуе побач з хворым сынам.)

Бездань – тое, што раздзяляе, раз'ядноўвае каго-небудзь з кім-небудзь, вялізная бездань паступова расце паміж блізкімі людзьмі, якія паступова становяцца чужымі, не разумеюць, нават пачынаюць ненавідзець адзін аднаго. (Бездань паміж маці і сынам.)

**9. Падагульненне ўрока. Вывады**

**Настаўнік:** Якое ж рашэнне вынесе наш суд Васілю? Гэта вырашаць вам. Але"няма горшага за той суд, якім судзіш сябе сам", – так сказаў аднойчы Іван Мележ.Чалавеку жыццё даецца для таго, каб ён пражыў яго годна, стварыў сваю сям’ю, пакінуў пасля сябе добрую памяць. Чалавек павінен змагацца за сваё шчасце, за сваю праўду. Ён не павінен здавацца, пасаваць перад праблемамі, ва ўсіх бедах вінаваціць кагосьці іншага. А калі ўсё ж такі жыццё завяло ў тупік, трэба шукаць у сабе сілы і ісці толькі наперад.

Сям’я – гэта галоўнае ў жыцці кожнага чалавека. Гэта ваша падтрымка і дапамога. Таму трэба паважаць і цаніць родных людзей.А тут я прыгадаю словы Арцёма Вярыгі-Дарэўскага (эпіграф):

Калі лад у сям’і,
Дык само дабро плыве
І крэпка сям’я жыве.

Ну а што ж наш Васіль? Што станецца з ім потым, пасля смерці маці? Ці зменіцца ён? Які чакае яго лёс?

**10. Дамашняе заданне**

Прыдумаць працяг апавядання, адказаўшы на пытанне: “Які лёс чакае Васіля пасля смерці маці?”

Пералік твораў да заняткаў:

1. Выстава кніг В. Праўдзіна.
2. Сучасная беларуская проза. Мінск, 2009.
3. Слоўнік фразеалагізмаў.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы.